Таким образом, внедрение интерактивных методов обучения – одно из важнейших направлений совершенствования подготовки студентов в современном учреждении высшего образования, эффективность которого подтверждается практически.

1. *Панина, Т. С.* Современные способы активизации обучения / Т. С. Панина, Л. Н. Вавилова ; под. ред. Т. С. Паниной. – М. : Академия, 2007. – 176 с.

2. *Реутова, Е. А.* Применение активных и интерактивных методов обучения в образовательном процессе вуза (методические рекомендации для преподавателей Новосибирского ГАУ) / Е. А. Реутова. – Новосибирск : Изд-во НГАУ, 2012. – 58 с.

**А. І. Бабко,**
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук*

# ФАРМІРАВАННЕ МЕТАДАЛАГІЧНЫХ АСНОЎ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФІІ

Навукова-даследчыя практыкі маюць вялікае значэнне ў кантэксце падрыхтоўкі студэнтаў УВА, і таму ад іх дзейснай арганізацыі шмат у чым залежыць эфектыўнасць усёй сістэмы вышэйшай адукацыі. Выніковасць навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў залежыць ад цэлага комплексу разнастайных фактараў і ўмоў, істотнае месца сярод якіх займае ступень падрыхтаванасці да яе вядзення. Паспрыяць развіццю адпаведных навыкаў, уменняў і кампетэнцый (а таксама адпаведнай матывацыі) можа і павінен выкладчык любой дысцыпліны вышэйшай школы. Але асабліва важную ролю мусяць выканаць выкладчыкі філасофіі. Гэта абумоўлена і рэфлексіўна-крытычным характарам філасофскага мыслення, і грунтоўным метадалагічным вымярэннем філасофскіх ведаў, і іх важкім эўрыстычным патэнцыялам.

Неабходна адзначыць, што ўкаранёныя ў самой існасці філасофскага пазнання багатыя магчымасці эфектыўнай арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў могуць быць выкарыстаны напоўніцу толькі ў выніку мэтанакіраваных намаганняў тых, хто выкладае філасофскія дысцыпліны. Найпер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шае, што ім неабходна зрабіць у дадзенай сітуацыі, – гэта пераканаць аўдыторыю ў стратэгічным значэнні філасофскіх ведаў для паспяховага разгортвання навуковага пошуку. Гісторыя філасофіі і навукі дае мноства аргументаў, на якія можна абаперціся пры вырашэнні згаданай задачы, і яны павінны быць задзейнічаны ў навучальным працэсе. Пры вывучэнні філасофіі Платона, напрыклад, варта паказаць, якое значэнне яна мела для розных галін навуковага пазнання (у тым ліку для сучаснай тэарэтычнай фізікі: В. Гейзенберг, які належыць да найвыдатнейшых яе прадстаўнікоў, абраў у якасці галоўнага філасофскага арыенціра менавіта платанізм [5, с. 322–326]).

Разам з тым надзвычай важна акрэсліць багацце і разнастайнасць філасофска-метадалагічных падстаў навуковага пазнання, што стварае праблемную навучальную сітуацыю і можа істотным чынам паспрыяць актыўнаму пошукаваму, творчаму вывучэнню філасофіі. Задача выкладчыка ў такой сітуацыі – накіраваць творчыя намаганні студэнтаў, указаць найбольш важныя арыенціры і паказаць, як здзяйсняліся адпаведныя пазіцыі ў працэсе разгортвання навуковага пазнання. Акрамя таго, неабходна давесці маладым даследчыкам, што выбар на карысць пэўнага філасофска-метадалагічнага праекта не з'яўляецца апошнім, завяршальным крокам у фарміраванні філасофскага падмурка іх навуковых пошукаў, што адпаведныя філасофскія прынцыпы яны павінны засвоіць на такім узроўні, які дазваляе задзейнічаць іх у даследчых практыках, актыўна, творча і паслядоўна здзяйсняць іх.

Як было падкрэслена вышэй, выяўленне і акцэнтуацыю рэлевантных у метадалагічных адносінах аспектаў дапускае ўвесь спектр філасофскай праблематыкі. Ёсць у гэтым спектры, аднак, сегменты з непасрэдным метадалагічным напаўненнем, што робіць іх асабліва важнымі ў кантэксце фарміравання філасофскай падставы навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Да такіх сегментаў належаць пытанні, звязаныя з разгортваннем дыялектычнай традыцыі ў гісторыі філасофіі. Іх вывучэнне мае грунтоўнае метадалагічнае значэнне найперш для ўніверсальнасці дыялектычнага моманту ў духоўных пошуках, для яго абавязковай прысутнасці ў творчым мысленні. Творчае мысленне абуджаецца праз наяўнасць крызісных з'яў, актуальных праблем, апарый, антыномій, на якіх і засяроджваецца дыялектыка.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У гісторыі філасофіі былі прапанаваны розныя версіі дыялектычнай метадалогіі, найбольш распрацаванай з якіх з’яўляецца рэалізаваная ў гегелеўскім «абсалютным ідэалізме». Варта адзначыць, што спекулятыўна-дыялектычная філасофская сістэма Гегеля ўяўляе сабой бліскучае ўвасабленне парадаксальнага мыслення: вырашэнне супярэчнасці адбываецца тут не праз адмову ад пэўнага з супрацьлеглых пачаткаў, што ўтвараюць яе, а праз аб’яднанне супрацьлеглых момантаў у жывым, рухомым адзінстве, дзякуючы чаму мысленне выходзіць на новы, больш высокі ўзровень самаразвіцця (так, Гегель востра крытыкуе Канта за няздольнасць убачыць станоўчы момант у супярэчнасці, якая на самой справе ўяўляе сабой не што іншае, як «узняцце розуму па-над абмежаваннямі разумення і іх касаванне» [4, с. 27] (тут і далей пераклад аўтара. – *А. Б.*); пры яе вырашэнні моманты, што канстатуюць яе, ні ў якім выпадку не знішчаюцца, не ператвараюцца «ў абстрактнае нішто», а губляюць толькі свой адмысловы змест [4, с. 35–36]. У іншай версіі дыялектычнай метадалогіі (яна здзяйсняецца, напрыклад, у філасофіі Канта) супярэчнасць разглядаецца як неабходны этап на шляху да праўды, але яе вырашэнне азначае яе поўнае пераадоленне, гэта значыць, мусіць адбывацца на аснове прынцыпу яе забароны, характэрнага для арыстоцелеўскага тыпу логікі.

Такім чынам, і ў дадзеным выпадку студэнт паўстае перад выбарам, які павінен быць зроблены ім свядома і на падставе глыбокага вывучэння адпаведных філасофскіх падыходаў. Праўда, гэты выбар можа ўскладніць той момант, што Гегель (і не толькі ён: сярод яго папярэднікаў і паслядоўнікаў у гэтым плане можна згадаць, напрыклад, М. Кузанскага, Э. Фрома) усталёўваў сваю спекулятыўную, «парадаксальную» дыялектыку менавіта на ўзроўні філасофскага мыслення, а навуку лічыў сферай кампетэнцыі арыстоцелеўскай логікі – логікі, якая грунтуецца на прынцыпе (не)супярэчнасці [1, с. 116]. Аднак працэсы, што адбываюцца ў сучаснай навуцы, хутчэй абвяргаюць гегелеўскую пазіцыю і сведчаць на карысць магчымасці плённага ўжывання спекулятыўна-дыялектычнай метадалогіі ў навуковых даследаваннях. Сярод такога кшталту сведчанняў можна прывесці той факт, што «Нільс Бор у апошнія гады свайго жыцця ўсё больш цікавіўся дыялектыкай Гегеля і бачыў у яго “Логіцы” філасофскі падмурак свайго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грунтоўнага для фізікі прынцыпу дапаўняльнасці» [6, с. 30] (Х.-Ю. Трэдэр, якому належыць згаданае выказванне, спасылаецца на свае асабістыя гутаркі з Л. Розенфельдам.)

У дадзенай сувязі неабходна адзначыць таксама іншы духоўны феномен (блізкі да дыялектыкі, хоць ступень гэтай блізкасці з'яўляецца прадметам дыскусій у філасофскай літаратуры [2, с. 1070]), які мае грунтоўнае метадалагічнае значэнне, – філасофскую герменеўтыку. Герменеўтычную традыцыю характарызуюць сувязі з гуманітарнымі навукамі, і таму адпаведная праблематыка набывае асаблівую важнасць, калі гаворка ідзе пра станаўленне філасофскіх асноў навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў-гуманітарыяў.

Філасофская герменеўтыка, як і дыялектыка, прэтэндуе на ўніверсальны метадалагічны статус. Яе пачынальнік Г.-Г. Гадамер абгрунтоўвае «ўніверсальнасць герменеўтычнага вымярэння» [2, с. 1071] яго непарыўнай сувяззю з мовай, у стыхіі якой адбываецца ўсякае разуменне, і ў якой увасабляецца сапраўды фундаментальная карціна свету, звязаная з натуральным дачыненнем чалавека да рэчаіснасці [3, с. 454–457]. Найважнейшай характэрнай рысай філасофскай герменеўтыкі з'яўляецца пераадоленне наіўнага аб'ектывізму, уяўлення, згодна з якім той, хто імкнецца штосьці зразумець, інтэрпрэтатар, навуковец павінен цалкам абстрагавацца ад усяго суб'ектыўнага, узняцца над канкрэтнай гістарычнай абумоўленасцю сваіх падыходаў, пазіцый, пошукаў і разглядаць прадмет сваіх даследаванняў выключна з яго самога, абсалютна аб'ектыўна і бесстаронна. Г.-Г. Гадамер указвае на ілюзорнасць і шкоднасць такога погляду: на самой справе наяўнасць папярэдніх меркаванняў адносна пэўнай гістарычнай падзеі, сакральнага тэксту, мастацкага твора ці заканадаўчага палажэння выступае як падстава для іх разумення [2, с. 1070]. Пры гэтым надзвычай важна мець на ўвазе папярэдні суб'ектыўны характар першапачатковых уяўленняў пра прадмет даследавання і настойліва працаваць з імі, выпраўляць, трансфармаваць іх, засяродзіўшы свой позірк на сутнасці самой справы, якая павінна дысцыплінаваць скіраваныя на яе разуменне і інтэрпрэтацыю намаганні [2, с. 1070].

Маючы на ўвазе задачу фарміравання метадалагічнай асновы навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў, надзвычай важна ў працэсе прапедэўтычнай рэканструкцыі філасофскай герме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неўтыкі падкрэсліць, што яе ідэі выявіліся як у найвышэйшай ступені плённыя на самых розных кірунках гуманітарнага пазнання [2, с. 1070]. У сувязі з гэтым робіцца відавочным найважнейшае значэнне прынцыпу міждысцыплінарнасці для вырашэння згаданай задачы.

Такім чынам, філасофія можа выявіць і рэалізаваць свой істотны творчы патэнцыял у працэсе фарміравання метадалагічнага падмурка навукова-даследчых практык студэнтаў толькі ў выпадку мэтанакіраваных (скіраваных менавіта на дасягненне дадзенай мэты) высілкаў яе выкладчыкаў. Змест філасофскай адукацыі ва УВА дае для гэтага шырокія магчымасці. Асаблівае значэнне набывае пры гэтым тэматыка, якая мае непасрэднае метадалагічнае напаўненне (напрыклад, пытанні, прысвечаныя дыялектычнай традыцыі ці філасофскай герменеўтыцы). Выніковасць згаданага працэсу шмат у чым вызначаецца інтэнсіўнасцю і шырынёй выкарыстання прынцыпу міждысцыплінарнасці ў яго рамках.


1. *Гегель, Г. В. Ф.* Наука логики / Г. В. Ф. Гегель // Энцикл. философ. наук : в 3 т. – М. : Мысль, 1974. – Т. 1. – 452 с.

2. *Gadamer, H.-G.* Hermeneutik / H.-G.Gadamer // Historisches Wörterbuch der Philosophie : in 13 Bänden / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1971–2007. – Bd. 3. – S. 1062–1073.

3. *Gadamer, H-.G.* Hermeneutik: Wahrheit und Methode. / H.-G. Gadamer. // Gesammelte Werke / H.-G. Gadamer. – Tübingen : Mohr Siebeck, 1990. – Bd.1 : Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik. – 495 S.

4. *Hegel, G. W. F.* Wissenschaft der Logik : in 2 Teilen / G. W. F. Hegel. – Berlin : Akademie Verlag, 1975. – T. 1. – 401 S.

5. *Heisenberg, W.* Der Teil und das Ganze : Gespräche im Umkreis der Atomphysik / W. Heisenberg. – München : R.Piper& Co Verlag, 1969. – 334 S.

6. *Treder, H.-J.* Über Hegels Beziehungen zur Naturwissenschaft / H.-J.Treder // Sitzungsber. der Akad. der Wiss. der DDR. – Gesellschaftswiss. : Jg.1982, G/8. – Berlin : Akademie Verlag, 1982. – S. 28–30.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ